# КНІГА ДЛЯ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ:

## ЧЫТАЮ, РАЗВАЖАЮ, АДГАДВАЮ




2 клас

ЭКОПЕРСПЕКТИВА

УДК 821(100)-93
ББК 84(0)
К 53

Складальнік *З. Я. Кузьміч*

**Кніга для пазакласнага чытання:** чытаю, разважаю, адгадваю : 
К53 2-і клас : дапам. для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рус. мовай навучання / склад. З. Я. Кузьміч. — Мінск : «Экоперспектива», 2023. — 187 с.
ISBN 978-985-469-957-8.

У дапаможніку прадстаўлены творы для пазакласнага чытання для вучняў 2-га класа. Усе творы скампанаваны ў 9-ці раздзелах, згодна колькасці ўрокаў пазакласнага чытання адпаведна вучэбнай праграме, размешчаны такім чынам, каб чытанне на беларускай мове не выклікала цяжкасцей, было пазнавальным і захапляючым. Займальны і практычны матэрыял будзе садзейнічаць актывізацыі чытацкай дзейнасці вучняў.

Дапаможнік можа выкарыстоўвацца на ўроках пазакласнага чытання па прадмеце «Літаратурнае чытанне», пры падрыхтоўцы да такіх урокаў, для самастойнага чытання вучняў дома.

Дапаможнік адпавядае праграме па вучэбным прадмеце «Літаратурнае чытанне» для 2-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

**УДК 821(100)-93**
**ББК 84(0)**

**ISBN 978-985-469-957-8**

© Кузьміч, З. Я., складанне, 2023
© Афармленне.
УП «Экоперспектива», 2023

## Дарагія сябры!

Ці ведаеце вы, колькі існуе на свеце кніг? Так, так! Незлічоная колькасць! Кожная кніга мае якія-небудзь таямніцы, але дапытлівы розум чалавека можа справіцца з імі.

Дадзены дапаможнік па чытанні запрашае вас у цікавае падарожжа. Слухаць і разумець мову роднай прыроды, пазнаваць разнастайныя цуды і таямніцы жыцця вы будзеце праз мілагучнасць роднай мовы.

Пазнавальныя творы дапаможніка дапамогуць вам навучыцца правільна і бегла чытаць. Да большасці твораў складзены цікавыя рэбусы, крыжаванкі і іншыя заданні, каб вы маглі зразумець іх сэнс і галоўную думку, а таксама каб чытанне было цікавым для вас.

Поспехаў вам!

## Першага верасня

Дзень святочны,
Дзень вясёлы.
Пахнуць яблыкі
Ў садах.
Мы ідзём
Сягоння ў школу,
Ранцы новыя
Ў руках.

Мы настаўніцу
Вітаем.
Ад усмешак
Светлы клас,
Нават восень
Залатая
Вельмі просіцца
Да нас.

*Міхась Пазнякоў*

## Верасень

Мне верасень руку падаў:
— Ты ў школу свой партфель сабраў?
— Сабраў партфель і сам сабраўся,
І з вольным летам развітаўся.
— Куды ж цяпер твой дзень імчыцца?
— Вучыцца, Верасень, вучыцца.

*Сяргей Панізнік*

## Хто вас у школу сабіраў?

Настаўнік першакласнікаў спытаў:
— Хто ў школу вас, скажыце, сабіраў?
— Пачуў адказы хутка ён тады:
— Ды мамы, таты, бабкі і дзяды.
— Так ды не так! І падказаць рашыў:
— Хто формы школьныя для вас пашыў?
Хто вам паперы многа добрай даў?
Хто напісаў вам шмат цікавых кніг?
У школу хто вас, дзеці, сабіраў?
Вы можаце назваць усіх?

*Авяр'ян Дзеружынскі*

**Расшыфруй рэбусы і запомні назвы асенніх месяцаў.**










### Верасень

Месяц Верасень багаты — у яго залатыя шаты[1]. Ходзіць ён па зямлі і дорыць ёй свае багацці.

Зайшоў Верасень у сады цяністыя, атрос ігрушы залацістыя. Асыпаў з яблынь духмяныя антонаўкі, чырвоныя крамяныя[2] малінаўкі, захінуў туманамі слівы сінія.

Выйшаў у поле, наставіў мяхоў бульбы, на лузе склаў у копы траву і падаўся ў лес.

Ідзе Верасень лесам, прыбірае дрэвы ў дарагія ўборы: бярэзінку — у золата, асіну — у чырвань, на дубы навесіў медны ўбор. Не забыўся і пра каліну ды рабіну, прыхарашыў іх пацеркамі чырвонымі. Пад пянёчкі ды пад кусточкі пасадзіў грыбочкі...

Азірнуўся Верасень, паглядзеў навокал: гарыць-палае асенні лес! Вось толькі ўнізе трава сухая і пажоўклая. Няма красак, адцвілі за лета.

---

[1] Шаты — лісцевае покрыва (крона (русск.)).

[2] Крамяны — свежы, гкі.

Страсянуў Верасень з дрэў буйную расу — і дзіва! Упалі да камлёў[3] зялёных сосен ды залатых бяроз драбнюткія званочкі! Зацвілі верасы! Загулі, зазвінелі званочкі! Клічуць дзяцей у школу.

Багаты месяц Верасень, багаты! Ён падараваў зямлі пышныя шаты.

Насыпаў поўныя засекі[4] збожжа. Адзеў у золата лясы і расквеціў верасы. Таму і завуць яго Верасень.

*Клаўдзія Каліна*

**У рэбусе зашыфравана прыказка. Расшыфруй яе.**




### Маладая восень

Залатыя стужкі
на бярозцы мілай.
Хутка, хутка птушкі
паляцяць у вырай.

І вятры крутыя
гучна загамоняць,
воблакі густыя
неба запалоняць.

А пакуль што — просінь
між аблокаў белых.
Маладая восень
толькі прыляцела.

*Васіль Жуковіч*

[3] Камель — ніжняя, патоўшчаная частка дрэва.
[4] Засекі — адгароджанае месца для збожжа.

## Хто каго перакрычыць?

Максімка з дзедам пайшлі ў грыбы. Хораша ў лесе! Высокія яліны акружылі палянку з усіх бакоў. На прыгрэтым сонцам пагорку хлопчык знайшоў сямейку лісічак і стаў зразаць грыбкі.

Калі Максімка ўзняў вочы, дзядулі побач не было. Хлопчык кінуўся ў адзін бок, у другі — дзед як скрозь зямлю праваліўся. Максімку раптам стала страшнавата. Ён дрыжачым голасам паклікаў:

— Дзеду!

І ў той жа момант нехта непадалёку азваўся:

— Ду-ду! Ду-ду!

— Ау! — грамчэй крыкнуў хлопчык.

Хтосьці невядомы, быццам гуляючы ў дражнілку, некалькі разоў паўтарыў «ау».

Максімка склаў рупарам далоні і закрычаў:

— Дзеду, ау!

Выразна пачулася:

— Ду-ду, ау!

Ад таго, што ён адзін і што нехта хоча з ім гуляць, хлопчыку зрабілася весела.

— Яшчэ пабачым, хто каго перакрычыць! — сказаў ён.

Не паспелі скончыць гульню, як з-за дрэва выйшаў дзядуля з поўным кошыкам грыбоў.

— Я — тут. Чаго крычыш? Што, страшна?!

— Не, гэта мы гулялі, хто каго перакрычыць.

— А-а! — зразумеў унука дзядуля.

А вы, дзеці, здагадаліся, з кім гуляў Максімка?

*Расціслаў Бензярук*

---

[5] Сту́жка — палоска каляровай тканіны, якая выкарыстоўваецца для ўпрыгожання.

[6] Вы́рай — цёплы край, куды адлятаюць пералётныя птушкі на зіму.

[7] Про́сінь — сіні адліў, сіні прасвет у афарбоўцы чаго-небудзь.

# ЗМЕСТ

**Дарагія сябры!** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

## КОЛЕРЫ ГОДА. ВОСЕНЬ

Першага верасня. *М. Пазнякоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
Верасень. *С. Панізік* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
Хто вас у школу сабіраў? *А. Дзеружынскі* . . . . . . . . . . . . . . . 4
Верасень. *К. Каліна* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Маладая восень. *В. Жуковіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Хто каго перакрычыць? *Р. Бензярук* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Залатая казка. *Я. Жабко* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
На прагулцы. *Н. Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Восень шыла сарафан. *М. Даніленка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9

## МАЁЙ РАДЗІМЫ ДЗІЎНЫ СВЕТ

Шпак і верабей. *Р. Бензярук* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Журка-журавель. *Н. Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Жураўліны вырай. *В. Жуковіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Размова з жураўлём. *М. Калачынскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Прыляцеў я ў свой край. *А. Дзеружынскі* . . . . . . . . . . . . . . 13
Васілёк. *А. Дзеружынскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Незаменнае. *В. Жуковіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Салдацкае пісьмо. *У. Ліпскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Міколкавы пытанні. *М. Пазнякоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Родная мова. *М. Пазнякоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Скарб. *М. Пазнякоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

## ЖЫВАЯ КНІГА БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ

Зубры. *Д. Бічэль-Загнетава* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Белавежа. *У. Караткевіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Вавёрка. *В. Вольскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Шышкі пад снегам. *Я. Галубовіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Рамантык. *Р. Ігнаценка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Птушыная сталоўка. *У. Мазго* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
Для чаго снягір каляровы? *І. Муравейка* . . . . . . . . . . . . . . . 26
Галкі грэюцца. *Я. Галубовіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Верабейка Чыка. *А. Марціновіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Зімовы сад. *І. Муравейка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Арабінка. *Н. Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
Абляпіха. *М. Даніленка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

## КОЛЕРЫ ГОДА. ЗІМА


Зіма. *М. Бусько* . . . . . 34

Беларуская зіма. *К. Жук* . . . . . 34

Першы снег. *К. Камейша* . . . . . 35

З першым снегам! *Ю. Свірка* . . . . . 36

Сняжынка. *Т. Бушко* . . . . . 36

Андрэйка-памочнік. *Я. Галубовіч* . . . . . 37

Як Петрык мароз напалохаў. *М. Даніленка* . . . . . 39

Снежная баба. *В. Жуковіч* . . . . . 40

Сінічка. *П. Прыходзька* . . . . . 42

Пад Новы год. *П. Ткачоў* . . . . . 42

Мікіткаў падарунак. *П. Ткачоў* . . . . . 45

За што люблю я Новы год? *В. Лукша* . . . . . 47


## СУСТРЭЧА З КАЗКАЙ


Дзедава рукавічка. (*Беларуская народная казка*) . . . . . 48

Камары і мядзведзь. (*Беларуская народная казка ў апрацоўцы М. Пазнякова*) . . . . . 50

Пра быка і яго сяброў. (*Беларуская народная казка*) . . . . . 51

Коцік, пеўнік і лісіца. (*Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча*) . . . . . 55

Не сілай, а розумам. (*Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча*) . . . . . 57

Піліпка-сынок. (*Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча*) . . . . . 59

Пшанічны каласок. (*Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча*) . . . . . 63

Сабака і воўк. (*Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча* . . . . . 67

Сынок-з-кулачок. (*Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча)* . . . . . 71

Як курачка пеўніка ратавала. (*Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча*) . . . . . 74


## УРОКІ ЖЫЦЦЯ


Ветлівы свавольнік. *Н. Галіноўская* . . . . . 77

Няўважлівыя лісяняты. *Н. Галіноўская* . . . . . 77

Чарадзейныя словы. *С. Панізнік* . . . . . 78

Добры дзень. *П. Пранузa* . . . . . 79

Каму сказаць «дзякуй»? *Я. Бяганская* . . . . . 79

Зернетка і вецер. *Л. Арабей* . . . . . 80

Сказ пра Мураша-лайдака. *Г. Аўласенка* ... 83
Заяц Доўгае Вуха. *М. Даніленка* ... 86
Салодкая цыбуля. *М. Даніленка* ... 87
Памочніца. *А. Дзеружынскі* ... 89
Наш мосцік. *Р. Ігнаценка* ... 89
Не хапіла работы. *Н. Парукаў* ... 91
На градцы. *П. Пранузa* ... 92
Тры лыжкі. *І. Муравейка* ... 92
Не ўмею, паспею... *В. Жуковіч* ... 94
Хто вінаваты? *В. Жуковіч* ... 95
Хто вінаваты? *А. Жук* ... 95
Хлеб. *М. Пазнякоў* ... 97
Заяц, вожык і ручай. *Р. Бензярук* ... 97
Клекатунчык. *Р. Бензярук* ... 99
Чыя моркаўка? (*З серыі «Казкі-загадкі»*) *Р. Бензярук* ... 101
Сябры. *Я. Бяганская* ... 102
Выпадак з марожаным. *М. Лук* ... 104
Ціма. *І. Муравейка* ... 105
Выратаваў. *Н. Галіноўская* ... 106
Хлопчык Пакідайчык. *К. Каліна* ... 107
Чыстая градка. *У. Карызна* ... 110
Два Васі. *У. Немізанскі* ... 110
Гузак. *В. Ткачоў* ... 111

## КЛОПАТ ПРА ТЫХ, ХТО НАВОКАЛ

Цікаўная котка. *А. Бутэвіч* ... 113
Жыў-быў вожык. *Я. Брыль* ... 116
Жыві сабе, зайчык! *П. Кавалёў* ... 121
Шэрая курачка. *П. Ткачоў* ... 124
Ласяня. (*Урывак з аповесці «Пра Сяргейку і лясных жыхароў»*) *П. Ткачоў* ... 126
Ласіны стажок. *Ю. Свірка* ... 128
Снегавічок. *Я. Пархута* ... 128
Сняжок. *Ю. Свірка* ... 130
Матылёк. *А. Ставер* ... 131
Бярозка. *М. Янчанка* ... 132

## КОЛЕРЫ ГОДА. ВЯСНА

Каб вясна хутчэй настала. *М. Маляўка* ... 134
Дзе начавалі рукавічкі? *Я. Бяганская* ... 134
Аб чым спяваюць птушкі? *Г. Аўласенка* ... 137
Вожык і ручаёк. *Я. Галубовіч* ... 137

Бярозавыя ледзянцы. *Я. Галубовіч* . . . . . . . . . . 138
Песня вясны. *К. Каліна* . . . . . . . . . . 140
Птушыныя напевы. *А. Дзеружынскі* . . . . . . . . . . 142
Шпак. *Т. Кляшторная* . . . . . . . . . . 143
Сябры вясны. *У. Мазго* . . . . . . . . . . 143
Няўжо вясна? *І. Муравейка* . . . . . . . . . . 143
Коцікі. *П. Саковіч* . . . . . . . . . . 144
Вясновая бярозка. *Н. Галіноўская* . . . . . . . . . . 144
Ганарлівая кветачка. *Г. Аўласенка* . . . . . . . . . . 145
Пчолы і кветкі. *С. Валодзька* . . . . . . . . . . 146
Пчолка. *Я. Журба* . . . . . . . . . . 147
Фіялка. *К. Каліна* . . . . . . . . . . 147
Сінютка-Анютка. *А. Кажэра* . . . . . . . . . . 148
Я вясну малюю. *П. Прануза* . . . . . . . . . . 150

## СЯМ'Я — ПРЫТУЛАК ДАБРЫНІ

Мама. *В. Хомчанка* . . . . . . . . . . 152
Самы любы мой даянёк... *Я. Жабко* . . . . . . . . . . 153
Маме. *Э. Агняцвет* . . . . . . . . . . 153
Песня для мамы. *Н. Галіноўская* . . . . . . . . . . 154
Малінавы чай. *Р. Бензярук* . . . . . . . . . . 154
Свая дапамога. *В. Жуковіч* . . . . . . . . . . 157
Маміны рукі. *П. Прануза* . . . . . . . . . . 158
Матуліны рукі. *В. Вярба* . . . . . . . . . . 158
Бабчыны дранікі. *А. Пісьмянкоў* . . . . . . . . . . 159
Бабуліна песня. *Н. Галіноўская* . . . . . . . . . . 159
Зязюля. *П. Сушко* . . . . . . . . . . 160
Апельсін. *В. Хомчанка* . . . . . . . . . . 160
Гузік. *В. Хомчанка* . . . . . . . . . . 161
Камп'ютаршчык. *Н. Галіноўская* . . . . . . . . . . 162
Кампот. *К. Каліна* . . . . . . . . . . 163
Цацкі. *У. Ліпскі* . . . . . . . . . . 163
Адно яечка на дваіх. *І. Муравейка* . . . . . . . . . . 166
Сам. *П. Прануза* . . . . . . . . . . 167
Хто самы моцны? *Я. Радкевіч* . . . . . . . . . . 168
Разумны аловак. *Д. Слаўковіч* . . . . . . . . . . 169
Незвычайны дыктант. *В. Ткачоў* . . . . . . . . . . 170
Свята Перамогі. *М. Рудзішкін* . . . . . . . . . . 171
Садзім алею. *М. Пазнякоў* . . . . . . . . . . 172
**Адказы** . . . . . . . . . . **173**
**Спіс выкарыстаных крыніц** . . . . . . . . . . **175**